**Шарупіч Е.** − магістрант

Навуковы кіраўнік: к. э. н., дац. Т. Бондар
Беларускі дзяржаўны універсітэт лістапада
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

# Арганізацыя інавацыйнай дзейнасці прадпрыемства як найважнейшы напрамак яго фінансавай работы

Найважнейшым напрамкам фінансавай работы сучасных прадпрыемстваў з'яўляецца арганізацыя інавацыйнай дзейнасці. Сёння спаўна ўсвядомлены той факт, што перспектывы ўстойлівага эканамічнага росту прадпрыемстваў не могуць рэалізавацца на аснове іх ранейшай матэрыяльна-тэхнічнай базы, ранейшых правілаў вядзення бізнесу. Паспяховасць дзейнасці прадпрыемстваў у сучасным свеце цалкам вызначаецца здольнасцю своечасова рэагаваць на выклікі часу, ўлоўліваць змены рынкавага попыту, асвойваць вытворчасць і рэалізацыю новага віду прадукцыі. Альтэрнатывы інавацыйнаму развіццю няма.

Развіццё інавацыйнай дзейнасці, як на ўзроўні асобнага прадпрыемства, так і на ўзроўні дзяржавы ў цэлым, патрабуе фінансавых рэсурсаў. Сістэма фінансавання інавацыйнай дзейнасці павінна забяспечваць стварэнне неабходных перадумоў для хуткага і эфектыўнага ўкаранення тэхнічных навінак, структурнатэхналагічнай перабудовы бізнесу, захавання і развіцця патэнцыялу ў прыярытэтных кірунках яго развіцця.

У цяперашні час у якасці асноўных крыніц сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для фінансавання інавацыйнай дзейнасці, выступаюць: бюджэтныя асігнаванні; уласныя сродкі прадпрыемстваў; крэдытныя рэсурсы.

Важным рычагом дзяржаўнага ўздзеяння на развіццё рэальнага сектара эканомікі выступае Беларускі інавацыйны фонд, які аб'яднаў 25 існаваўшых раней асобна галіновых інавацыйных фондаў. Цэнтралізацыя гэтых сродкаў дазволіла ўзмацніць адраснасць і павышэнне эфектыўнасці кіравання выдаткамі на навукова даследчую, вопытна канструктарскую работу і інавацыі, палепшыць прыцягненне, адбор і фінансаванне інавацыйных праектаў з улікам нацыянальных прыярытэтаў.

Ва ўмовах абмежаванасці ўласных, бюджэтных, крэдытных крыніц фінансавання інвестыцый вялікае значэнне набываюць альтэрнатыўныя крыніцы сродкаў. Да такіх сучасных фінансавых метадаў актывізацыі інавацый можна аднесці венчурнае інвеставанне. Само слова «venture» у перакладзе з ангельскага азначае рызыкоўнае пачынанне. Коратка працэс венчурнага фінансавання можна апісаць наступным чынам: венчурны фонд выкупляе частку (долю) акцыянернага капіталу кампаніі − аб'екта інвеставання. Аб'ект інвеставання – гэта, як правіла, маладая кампанія (стартап), якая прыступіла да рэалізацыі перспектыўнага навукаёмістага інавацыйнага праекта, знаходзіцца на пачатковым этапе яго ажыццяўлення і мае патрэбу ў сродках для яго рэалізацыі.

Венчурнае інвеставанне дапускае магчымасць адсутнасці фінансавай аддачы ў першыя гады рэалізацыі радыкальнага інавацыйнага праекта і не выключае магчымасць адмоўнага выніку. Пры гэтым, у першыя гады ініцыятар інавацыйнага праекта не нясе адказнасці перад інвестарамі за расходаванне сродкаў і не выплачвае па іх дывідэнды. У сваю чаргу, венчурныя інвестары першыя некалькі гадоў задавальняюцца набыццём пакета акцый фінансуемага прадпрыемства. Калі інвестуемае прадпрыемства пачынае даваць прыбытак, то ен з'яўляецца асноўнай крыніцай ўзнагароджання венчурных інвестараў, якія нярэдка становяцца уласнікамі гэтага прадпрыемства.

Стартап карыстаецца венчурнымі інвестыцыямі, развіваецца, павялічвае свой кошт. Праз некаторы час ажыццяўляецца зваротны працэс абмену, набытай венчурнымі інвестарамі долі

*© Шарупіч Е., 2020*

капіталу (акцый), на грашовыя сродкі. Матэрыяльнае напаўненне долі да гэтага часу змянілася і венчурны інвестар фіксуе свае прыбытак (страту) ад гэтай здзелкі. Па прычыне навукаёмістасці венчурнага праекта інвестар разлічвае атрымаць павышаны прыбытак, але па прычыне рызыкоўнасці праекта ен яму не гарантуецца. У той жа час, на думку спецыялістаў, для інвестара, нацэленага на перспектыву, стартап ўяўляе вялікую цікавасць.

У Рэспубліцы Беларусь венчурнымі інвестыцыямі займаецца Беларускі інавацыйны фонд. Ён аб'яўляе конкурс на ўдзел у інавацыйных праектах. Да ўдзелу ў конкурсе праектаў запрашаюцца беларускія кампаніі, якія маюць перспектыўныя інавацыйныя распрацоўкі, перш за ўсё, у сферы прамысловых тэхналогій. Найбольшую цікавасць уяўляюць такія сектары, як прыборабудаванне, мікраэлектроніка, медыцына, фармацэўтыка, біятэхналогіі. Беларускім кампаніям прапануецца магчымасць атрымаць фінансаванне іх інавацыйных праектаў на індывідуальных умовах, праз уваходжанне суменага фонду ў статутны капітал [1].

Да венчурнага фінансавання ў нашай краіне падключаны таксама Банк развіцця Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі Банка развіцця адзначаюць, што класічная праграма крэдытавання ў іх дзейнічае, але яны бачаць, што ёсць частка праектаў, якім крэдыт не падыходзіць, для іх важна венчурнае фінансаванне. Таму Банк развіцця прыняў рашэнне пашыраць гэты кірунак банкаўскага бізнесу, развіваць яго. Разглядаецца некалькі варыянтаў формаў венчурнага фінансавання. Адзін з іх – інвестыцыі ў партнёрстве з Беларускім інавацыйным фондам, якія маюць невялікі вопыт такога фінансавання. Другі варыянт − «фонд фондаў»: умоўна, Банк развіцця стварае фонд і фінансуе больш дробныя фонды, якія непасрэдна разглядаюць венчурныя праекты. Альбо Банк развіцця будзе ствараць нейкую даччыную арганізацыю і сам непасрэдна ўвойдзе ў праекты. На сёння ясна адно – прамога фінансавання з боку банка не прадугледжваецца [2].

На шляху стварэння інавацыйнай венчурнай сістэмы ў Беларусі маецца шэраг бар'ераў, зняцце якіх, змагло б надаць венчурнаму фінансаванню неабходны штуршок да развіцця. Разгледзім асноўныя з іх:

1) для стварэння неабходных спрыянняў венчурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь неабходна прадоўжыць работу па разняволенні дзелавой ініцыятывы і творчага патэнцыялу грамадзян, па фарміраванні развітога канкурэнтнага асяроддзя. Спосаб дасягненне гэтай мэты вядомы – развіццё малога і сярэдняга бізнесу. Найбольш шырокае распаўсюджванне ў свеце атрымліваюць малыя і сярэднія прадпрыемствы, якія паспяхова канкуруюць з буйнымі. Аднак, у Беларусі малое прадпрыемства дагэтуль не стала значным гаспадарчым суб'ектам, паўнавартасным і паўнапраўным удзельнікам эканамічных працэсаў [3];

2) сур'ёзнай праблемай стрымліваючай венчурную дзейнасць у Беларусі з'яўляецца адсутнасць новых прарыўных тэхналогій. На 100 беларускіх праектаў прыпадае толькі 5−7 тэхналогій, у якіх прысутнічае хаця б лакальная навізна, напрыклад, у рамках СНД. Праектаў з сусветнай навізной практычна не сустракаецца. Праекты, арыентаваныя толькі на імпартазамяшчэнне, у большасці сваёй нецікавыя для венчурных інвестараў, так як пры высокіх прадпрымальніцкіх рызыках не з'яўляюцца высокапрыбытковымі.

3) у беларускіх ВНУ не наладжана падрыхтоўка кваліфікаваных кіраўнікоў венчурнымі фондамі, менеджараў, якія валодаюць бізнес-навыкамі для камерцыялізацыі навуковых распрацовак. Недахоп вопыту прыводзіць беларускіх інвестараў да запуску новых праектаў без удакладнення «правілаў гульні», без вызначэння парадку «выхаду» з праекта. Венчурны інвестар павінен мадэляваць свой партфель інвестыцый, разумеючы, што толькі частка з іх будзе паспяховая. Ён павінен валодаць пэўнай інвестыцыйнай культурай.

Па-за усялякіх сумневаў венчурнае фінансаванне павінна разглядацца на перспектыву ў ролі дзейснага інструмента росту беларускай эканомікі на аснове яе інавацыйнага развіцця. А гэта значыць, што арганізацыя венчурнага фінансавання, увага да інавацыйнай дзейнасці і далей будуць разглядацца найважнейшымі напрамкамі фінансавай работы сучасных прадпрыемстваў.

***Крыніцы і літаратура***

1. Беларускі інавацыйны фонд. URL: http://www.bif.ac.by/rus/bif/aboutbelinfonde.html (дата доступу: 25.09.2020).
2. Банк развіцця Беларусі можа пачаць венчурнае фінансаванне. URL: https://primepress.by/news/finansi/bank_razvitiya_belarusi (дата доступу: 29.09.2020).
3. Праблемы інавацыйнага прадпрымальніцтва ў Беларусі. *Бізнес саюз прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага*. URL: http://bspn.by/content/view/3007/799/ (дата доступу: 27.09.2020).

**Швець П.** – к. е. н., с. н. с.
Інститут демографії та соціальних досліджень НАН України;
**Бабич Р.** – к. е. н., доц.
Національний авіаційний університет
м. Київ, Україна

## Інноваційні засади розвитку економіки України в умовах неоіндустріального суспільства

Зміни, що відбуваються у світовій економіці в XXI ст., відповідають переходу до нового етапу розвитку продуктивних сил, переходу від індустріальної економіки до економіки неоіндустріального типу, де будуть домінувати сфера послуг, наука й освіта.

Неоіндустріалізація – це процес масштабного впровадження комплексу сучасних технологій в промисловості, в результаті чого відбувається:

– часткова зміна парадигми виробничої діяльності;

– інтегроване безперервне автоматичне управління розширеним виробничим циклом продукції;

– новий етап роботизації виробництва, що дозволяє органічно поєднувати працю машини та людини.

Неоіндустріалізація є поширенням інфо-комунікаційної технологічної революції безпосередньо в виробничий процес.

Інноваційна складова утвердилася як найважливіший чинник економічного зростання, основа конкурентоспроможності фірм, корпорацій, галузей, національних економік. Інноваційний чинник став стратегічним, основоположним засобом розвитку суспільств та економік за останню чверть XX ст. та на початку XXI ст. Якщо на початку XX ст. внесок науки і технології у розвиток економіки країн оцінювали у 33 %, то наприкінці – у 70–80 %.

Інновації, як основний чинник соціально-економічної трансформації суспільства, відіграють вирішальну роль в еволюції економічної системи. Зародження, формування та становлення теорії інноваційного розвитку відбувається в контексті соціально-економічного розвитку суспільства та обумовлюється складністю і багатогранністю проблем інноваційної сфери.

За оцінками, сучасне економічне зростання розвинутих країн світу характеризується визначальним значенням науково-технічного і технологічного прогресу та інтелектуалізацією основних факторів виробництва. Внесок інноваційної складової в приріст ВВП розвинених країн збільшився: в США з 31,0 % у 1980-ті роки до 34,6 % на початку нового століття, у Японії відповідно з 30,6 до 42,3 %, у Європі з 45,5 до 50,0 %.

Розвиток будь-якої держави залежить не тільки від того, як буде розвиватися економічна діяльність, але й від здатності сприймати і генерувати знання, тобто – інноваційного потенціалу, що є одним з основних факторів розвитку та підвищення конкурентоспроможності краї-

*© Швець П., Бабич Р., 2020*